Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57

DOI:10.17951/sb.2023.17.65-87
Studia Białorutenistyczne 17/2023 HISTORY, CULTURE AND SOCIOLOGY
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270
Licence: CC BY 4.0

Yury Vnukovich

The Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk (Belarus)
e-mail: jurasis22@gmail.com
https://orcid.org/0000-0003-2037-8150

# Маркеры этнічнай ідэнтычнасці жыхароў Віленшчыны (па матэрыялах палявых этнаграфічных экспедыцый пачатку XXI ст.)

*Markers of the Ethnic Identity of the Inhabitants of Vilnius Region (on the Material of Ethnographic Field Expeditions of the Beginning of the 21st Century)*

*Markery tożsamości etnicznej mieszkańców Wileńszczyzny (na materiale etnograficznych wypraw terenowych z początku XXI wieku)*

**Abstract**

The article presents an analysis of ways to articulate one's and another's ethnic identity of the inhabitants of Vilnius region on the basis of linguistic, territorial and religious markers of distinctiveness. The research is based on the ethnographic fieldwork materials collected in 2007-2011. Language is the most significant marker of ethnic identity in the Belarusian-Lithuanian borderland, where it is difficult to find other contrasting cultural differences between Lithuanians, Poles and Belarusians. For example, in Vilnius region Lithuanians are most often identified by local Slavic-speaking residents on the basis of this feature. However, in the case of people who speak a regional variant of the Belarusian language in Vilnius region, we are dealing with an ethnic anomaly or liminal category – often referred to as locals ("people from here"). Residents who consider themselves Poles call their language simple (prostaya mova). For them, it is no longer a direct marker of ethnicity. In this case, other determinants become markers of identity. First of all, it is the territory of origin and religion that situationally signal the ethnic boundaries between Lithuanians, Poles and Belarusians of Vilnius region.

**Keywords**: ethnicity, identity, markers of distinctiveness, Belarusian-Lithuanian borderland, Vilnius region

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



**Abstrakt**

W artykule przedstawiona jest analiza sposobów na artykułowanie swojej i cudzej tożsamości etnicznej mieszkańców Wileńszczyzny na podstawie językowych, terytorialnych i religijnych wyznaczników odrębności. Badanie opiera się na etnograficznych materiałach terenowych zebranych na początku XXI wieku. Język jest najważniejszym markerem tożsamości etnicznej na pograniczu białorusko-litewskim, gdzie ciężko jest odnaleźć inne kontrastujące odrębności kulturowe między Litwinami, Polakami i Białorusinami. Na przykład Litwini są najczęściej identyfikowani przez lokalnych mieszkańców słowiańskojęzycznych na podstawie akurat tej cechy. Natomiast w przypadku osób posługujących się regionalną odmianą języka białoruskiego na Wileńszczyźnie mamy do czynienia z anomalią etniczną lub kategorią liminalną, często określaną jako *tutejsi*. Mieszkańcy, którzy uważają się za Polaków, nazywają swój język *prostym*. Dla nich nie jest on już bezpośrednim wyznacznikiem przynależności etnicznej. W tym przypadku inne wyznaczniki stają się markerami tożsamości. Przede wszystkim jest to terytorium pochodzenia i religia, które sytuacyjnie sygnalizują etniczne granice między Litwinami, Polakami i Białorusinami Wileńszczyzny.

**Słowa kluczowe:** etniczność, tożsamość, wyznaczniki odrębności, pogranicze białorusko-litewskie, Wileńszczyzna

**Анатацыя**

У артыкуле разглядаецца, як жыхары Віленшчыны артыкулююць сваю і чужую этнічную ідэнтычнасць, выкарыстоўваючы моўныя, тэрытарыяльныя і рэлігійныя маркеры адметнасці. Даследаванне выканана на падставе палявых этнаграфічных матэрыялаў, сабраных у пачатку XXI ст. Мова з’яўляецца найважнейшым маркерам этнічнай ідэнтычнасці на беларуска-літоўскім памежжы, дзе мы не знаходзім іншых кантрасных культурных адрозненняў паміж літоўцамі, палякамі і беларусамі. Напрыклад, літоўцы часцей за ўсё ідэнтыфікуюцца мясцовымі славянамоўнымі жыхарамі паводле гэтай прыкметы. Аднак у выпадку з носьбітамі рэгіянальнага варыянта беларускай мовы на Віленшчыне мы сутыкаемся з этнічнай анамаліяй або лімінальнай катэгорыяй, якая нярэдка вызначаецца як *тутэйшыя*. Сваю мову мясцовыя жыхары, якія лічаць сябе палякамі, называюць *простай* і для іх яна ўжо не з’яўляецца прамым індыкатарам этнічнай прыналежнасці. У гэтым выпадку маркіруючае значэнне набываюць іншыя прыкметы ідэнтычнасці – найперш тэрыторыя паходжання і рэлігія, якія сітуацыйна сігналізуюць пра этнічныя межы паміж літоўцамі, палякамі і беларусамі Віленшчыны.

**Ключавыя словы:** этнічнасць, ідэнтычнасць, маркеры адрознасці, беларуска-літоўскае памежжа, Віленшчына

## Уводзіны

Выключную ролю ў фарміраванні тэрытарыяльных сувязей усходняй Літвы і заходняй Беларусі ад моманту свайго заснавання адыгрываў горад Вільня, вакол якога на працягу стагоддзяў выбудоўваліся сімвалічныя радыяльныя восі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



„цэнтр-перыферыя”. Шматэтнічнае насельніцтва гістарычнай Віленшчыны амаль да канца XX ст. было цесна звязанае паміж сабой у сацыяльным, эканамічным, культурным і моўным дачыненні, практыкавала рэгулярны абмен інфармацыяй і таварамі на мясцовых рынках, падтрымлівала шлюбныя кантакты і сваяцкія сувязі. Хоць контуры і канфігурацыя гэтай тэрыторыі неаднаразова змяняліся, яна нязменна ўзнаўлялася ў выглядзе асобнай адміністрацыйнай адзінкі ў складзе розных дзяржаў[1]. Гэта дае падставы разглядаць Віленшчыну як адметны гістарычны рэгіён, які ўяўляў пэўнае адзінства як у масавай свядомасці людзей, што тут пражывалі, так і ва ўяўленнях яго даследчыкаў і адміністратараў. У гэтым сэнсе ментальная карта Віленшчыны значна шырэйшая за сучасныя адміністрацыйныя межы існуючага цяпер Віленскага павета і ахоплівае не толькі паўднёва-ўсходнюю Літву, але і паўночна-заходнюю Беларусь.

Даследчыкі, якія пісалі ў XIX–XX стст. пра этнічную спецыфіку Віленскага краю, добра ўсведамлялі, што на гэтай памежнай тэрыторыі адбываліся разнастайныя і рознаскіраваныя этнічныя працэсы. Большасць аўтараў трактавалі гэтыя працэсы ў межах існуючых тады тэарэтычных прынцыпаў і схем, калі ўсе людзі без выключэння павінны размяркоўвацца без рэшты па нацыянальных „ячэйках”. Згодна з гэтай пазіцыяй кантакт паміж этнічнымі групамі прыводзіць да асіміляцыі: больш слабая група асімілюецца і робіцца падобнай да больш моцнай. Працэс асіміляцыі займае пэўны час, і на прамежкавых яго этапах могуць з’яўляцца групы, адносна этнічнай прыналежнасці якіх можа не быць яснасці.

Фіксуючы працэс асіміляцыі і адзначаючы яго шырокую распаўсюджанасць у беларуска-літоўскім памежжы (Turska, 1939/1982; Grinblat, 1959; Kalnius, 1998),

[1] Асобнае Віленскае ваяводства, контуры якога на ўсходзе аддалена нагадвалі прасторавыя рубяжы гістарычнай Літвы, было створана ў пачатку XV ст. з мэтай умацавання і цэнтралізацыі поліэтнічнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Пасля далучэння ВКЛ да Расійскай імперыі, неаднаразова рэфармаваная ў XIX ст. адміністрацыйная адзінка з цэнтрам у г. Вільні атрымала назву Віленскай губерні. Яе тэрыторыя ў 1920–1922 гг. стала фактычнай асновай для стварэння асобнай намінальнай дзяржавы – Сярэдняй Літвы, што маніфеставала сваю – сімвалічную незалежнасць. З 1926 па 1939 г. у складзе міжваеннай Польшчы (Другой Рэчы Паспалітай) існавала Віленскае ваяводства. Пасля ўсталявання сучасных палітычных межаў у 1939–1940 гг. землі гістарычнай Віленшчыны былі канчаткова падзелены паміж Беларуссю і Літвой. Гэта адпаведным чынам стала ўплываць на акумуляцыю адрозненняў і этнічную ідэнтыфікацыю мясцовага насельніцтва. Тым не менш, у савецкі перыяд перашкод для перамяшчэння жыхароў паміж саюзнымі рэспублікамі практычна не існавала, што садзейнічала развіццю і ўмацаванню цесных прыгранічных сувязей. Гэтыя кантакты паступова аслаблі толькі ва ўмовах новай геапалітычнай рэальнасці, калі ў канцы XX ст. паміж Беларуссю і Літвой быў усталяваны візавы рэжым і памежны кантроль. Пандэмія Covid-19, палітычны, міграцыйны і гуманітарны крызісы 2020–2022 гг. сталі трыгерамі ўзвядзення новай „жалезнай заслоны” паміж жыхарамі Еўрапейскага Саюза і Рэспублікі Беларусь, што выключна адмоўна адбілася на этнакультурных, гандлёвых, сямейных і псіхалагічных сувязях „беларускай” і „літоўскай” частак гістарычнай Віленшчыны.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



даследчыкі, як правіла, наракаюць, што падобныя выпадкі перашкаджаюць дакладна катэгарызаваць насельніцтва па нацыянальнасцях. Такія пераходныя выпадкі, вядомыя ў розных зонах міжэтнічнага ўзаемадзеяння (Vahtin, Golovko, Švajtcer, 2004, s. 69–83), дрэнна ўпісваліся ў простыя схемы: розныя этнічныя прыкметы могуць указваць у супрацьлеглыя бакі. Напрыклад, ідэнтыфікацыя чалавека паводле мовы і паводле іншых прыкмет на Віленшчыне не заўсёды супадае: „паводле мовы" – беларус, але „паводле самасвядомасці" – паляк, а „паводле паходжання" – увогуле літовец.

Ужо ў XIX ст. вызначэнне этнічнай прыналежнасці жыхароў Віленскай губерні было вельмі спрэчным і праблематычным заняткам для тых, хто намагаўся правесці лінію і адрозніць беларусаў, літоўцаў і палякаў на падставе вонкавай інфармацыі. Аўтар папулярных „Рассказов о Литве и литовцах" у канцы XIX ст. гэтак апісваў блытаніну ў вызначэнні этнічнасці жыхароў Віленскай губерні:

> В некоторых местах Виленской губернии часто о человеке нельзя сказать, кто он – литовец или белорус: бороды не носит, католик, платье покроя литовскаго, а речь у него белорусская с примесью польских слов, да и фамилия – какой-нибудь Гайдун, Чижик – совсем не литовская. На границе с Польшей ошибиться еще легче, потому что платье и лица поляков и литовцев очень сходны, да и вера у них одна и та же. Настоящих литовцев можно видеть в самом сердце литовскаго народа – в Ковенской губернии, и то только в деревне, а не в городах, потому что литовцы, мещане, переняли язык и обычаи поляков (G.R., 1896, s. 4).

Такім чынам, першасны спосаб візуальнай ідэнтыфікацыі „беларускага", „літоўскага" або „польскага" на падставе выключна вонкавых этнаграфічных прыкмет не працаваў у беларуска-літоўска-польскім памежжы ўжо ў XIX ст. Іншымі словамі, ні фізічны воблік, ні традыцыйнае адзенне, ні жыллё, ні харчовыя звычкі, ні гаспадарчыя заняткі не дазвалялі дакладна распазнаць і выразна адрозніць польскую, літоўскую або беларускую этнічнасць.

Пра адсутнасць прынцыповых функцыянальных адрозненняў у беларускай і літоўскай сялянскіх культурах Віленскага ваяводства пісала яшчэ ў 30-я гг. XX ст. этнолаг Ц. Бадуэн дэ Куртэнэ-Эрэнкрэйц. Яна падкрэслівала, што збліжэнне этнічных груп беларусаў і літоўцаў у памежным рэгіёне адбываецца галоўным чынам на фоне падабенства іх галоўнага занятку – земляробства (Baudouin de Courtenay-Ehrenkreutzowa, 1930, s. 173). Наконт практычна поўнай неадрознасці і, як вынік, немагчымасці вылучыць чыста „літоўскія" альбо „беларускія" рысы ў традыцыйнай культуры сельскіх жыхароў беларуска-літоўскага памежжа пісалі многія даследчыкі другой паловы XX – пачатку XXI ст. Так, літоўскі этнолаг Р. Мяркене, якая прысвяціла шэраг прац параўнальнаму вывучэнню матэрыяльнай культуры Заходняй Беларусі і Усходняй Літвы, адзначае: „У першай палове XX ст. тыпалагічныя ізаглосы многіх з'яў культуры мелі розны напрамак і сведчылі пра перасячэнне паўночных і паўднёвых, усходніх і заходніх

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



культурных уплываў, генезіс якіх насамрэч немагчыма звязаць з канкрэтнымі народамі ці тэрыторыямі. Напрамкі змен арэалаў прымушаюць меркаваць, што вялікі ўплыў на культуру гэтай тэрыторыі мелі палітычна-адміністрацыйныя межы, якія шмат разоў змяняліся" (Merkienė, 1997, s. 73).

Пад уплывам генератыўнага падыходу да разумення этнічнасці, распрацаванага нарвежскім антраполагам Ф. Бартам, згодна з якім галоўнай прыкметай этнічнай групы ёсць прыпісванне ідэнтычнасці сабе і прыпісванне яе іншым (Barth, 1969, s. 10–16), складаны і шматузроўневы працэс этнічнай ідэнтыфікацыі насельніцтва памежных тэрыторый усё часцей аналізуецца з пункту гледжання самаапісання і самаразумення людзей, якія там пражываюць. Мэта гэтага артыкула – на падставе палявых этнаграфічных матэрыялаў, сабраных на Віленшчыне ў пачатку XXI ст., разгледзець маркеры літоўскай, беларускай і польскай этнічнасцей, што вылучаюць і артыкулююць менавіта самі жыхары памежнага рэгіёна.

Эмпірычны матэрыял быў сабраны ў час палявых даследаванняў, арганізаваных у межах этнаграфічнай практыкі студэнтаў-беларусістаў ЕГУ пад кіраўніцтвам аўтара. Яны праводзіліся ў 2007–2011 гг. у Віленскім (у мястэчках Меднікі, Рукойні, Шумск, Лаварышкі, вёсках Адамчукі, Барванішкі, Бурнішкі, Віндзюны, Вялікая Касіна, Гейбулі, Дзеканішкі, Жэмайтэлі, Каляснікі, Кена, Кулі, Масцішкі, Няверышкі, Паненская Касіна, Рудоміна, Савічуны, Свіраны, Сіруцішкі, Слабада, Чапурнішкі) і Салечніцкім (у мястэчках Табарышкі, Тургелі, Малыя Салечнікі, Яшуны, вёсках Будойці, Гай, Жлоўкты, Міхнова, Навасяды, Паўлова, Яцканы) раёнах Літвы. Усяго было апытана больш 80 інфармантаў (галоўным чынам жыхароў сталага веку, якія лічаць сябе палякамі і ў штодзённым жыцці гавораць пераважна на мясцовым дыялекце беларускай мовы)[2].

Фрагменты цытаваных інтэрв'ю падаюцца з захаваннем дыялектных асаблівасцей.

## Мова як этнічны вызначальнік жыхароў Віленшчыны

Найбольш кантрастыўнай прыкметай літоўцаў, палякаў і беларусаў памежнага рэгіёна была і застаецца мова, якая найчасцей выкарыстоўваецца пры абгрунтаванні свайго або чужога этнічнага статусу, а таксама ляжыць у падмурку этнічнай дыхатамізацыі і стэрэатыпізацыі (Vnukovìč, 2012; Unukovičius, 2014). На постсавецкай прасторы моўны маркер у якасці этнадыферэнцыяльнага схільныя выкарыстоўваць не толькі самі жыхары: дзяржава і даследчыкі вядуць сябе гэтаксама, прыпісваючы людзям нацыянальнасць паводле роднай або размоўнай мовы (Vahtin, Golovko, Švajtcer, 2004, s. 151).

[2] Вялікая частка экспедыцыйных матэрыялаў была надрукавана ў зборніку „Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні" (Vnukovìč, 2014, 2015, 2016, 2017, 2018, 2019, 2020, 2021).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Вось некалькі тыповых адказаў інфармантаў, атрыманых на зададзенае „у лоб" пытанне „Чым адрозніваюцца мясцовыя палякі, літоўцы і беларусы?":

> (Як пазнаць што літовец, што нелітовец?) Ну як пазнаць? Па размове (мяст. Тургелі, Салечніцкі р-н, мужчына, 1925 г. н.) (AIMEF, 2, s. 61).

> (Ну а чым атлічаюцца літоўцы ад палякаў? Можа святы другія святкавалі? Ці што яны?) Не. Вера – адна. Всё тое самае. (Толькі што гавораць па-другому?) Гавораць па-другому (мяст. Рукойні, Віленскі р-н, жанчына, 1927 г. н.) (AIMEF, 1, s. 12).

> (А вот этыя палякі, то ад беларусаў ці адрозніваюцца чым?) Анічым яны не адрозніваліся, адзінакавыя. (А ад літоўцаў?) Ну ў літоўцаў разгавор толька інакшы, літоўскі (в. Жлоўкты, Салечніцкі р-н, мужчына, 1934 г. н.) (AIMEF, 2, s. 85).

> (А як пазнаць чалавека: ці паляк, ці літовец, ці беларус?) Беларус і паляк – эта тое самае. (А літовец ужо?) Сматра на каго наскочыш (мяст. Тургелі, Салечніцкі р-н, мужчына, 1959 г. н.) (AIMEF, 2, s. 25).

Такім чынам, першая і асноўная сімвалічная мяжа паміж этнічнымі групамі для жыхароў памежнага рэгіёна праходзіць па мове. Гэтая мяжа найбольш выразна аддзяляе літоўцаў ад славянамоўных груп палякаў, беларусаў, рускіх. У значна меншай ступені яна відавочная ў сітуацыях адрознівання палякаў і беларусаў. Калі польская мова для мясцовага насельніцтва таксама з'яўляецца прамым індыкатарам польскай этнічнасці, то ў выпадках выкарыстання так званай „простай мовы" – звычайна рэгіянальнага варыянта беларускай мовы[3], прынцып лінгвістычнай ідэнтыфікацыі дае збой і перастае працаваць.

Прывядзём у якасці ілюстрацыі такога збою паўанекдатычны аповед, запісаны ад ураджэнца Іўеўскага раёна Беларусі, які стала жыве на тэрыторыі Салечніцкага раёна Літвы і лічыць сябе палякам, хоць у жыцці размаўляе пераважна на беларускай („простай") мове:

> Як мне ваенны білет выдавалі ў ваенкамаце ў Іўі. Ну і пытаяцца нацыянальнасьць.
> – Паляк.
> – Радной язык?
> – Беларускі.
> – А знаніе іністранных языкоў?

[3] Варта адзначыць, што эпітэт „просты" сітуацыйна можа выкарыстоўвацца і ў дачыненні да мясцовых гаворак польскай і літоўскай моў (Kozłowska-Doda, 2021). Аднак паняцце „простай мовы" як мовы „простага люду" (г. зн. сялян) найперш было распаўсюджана на тэрыторыі рассялення беларусаў (асабліва ў заходняй яе частцы, дзе насельніцтва характарызавалася размытай этнічнай самаідэнтыфікацыяй).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



– Польскі.
Як паняць? (мяст. Тургелі, Салечніцкі р-н, мужчына, 1934 г. н.) (AIMEF, 2, s. 32).

Нягледзячы на тое, што сельскія жыхары шэрагу памежных раёнаў паўднёва-ўсходняй Літвы і паўночна-заходняй Беларусі выкарыстоўваюць у хатнім побыце галоўным чынам беларускую мову, яны настойваюць на сваёй польскай ідэнтычнасці, выкарыстоўваючы адпаведную саманазву *пал́які* / *палякí*. Такая самаідэнтыфікацыя базіруецца ўжо не на крытэрыі размоўнай мовы, а на іншых дыферэнцыяльных прыкметах і сімвалічных знаках адрознення, якія інфарманты знаходзяць і выказваюць самі для дэманстрацыі сваёй этнічнасці.

Прыпісванне польскага паходжання сабе ў беларускамоўнага каталіцкага насельніцтва паўднёва-ўсходняй Літвы і паўночна-заходняй Беларусі ў большай ступені заснавана на разнастайных практыках інскрыпцыі ідэнтычнасці[4], на асабістым вопыце сацыялізацыі ў польскіх школах, а таксама калектыўнай памяці, што адсылае да часоў знаходжання тэрыторыі ўсяго Віленскага краю ў складзе Польшчы.

У якасці сведчанняў польскай этнічнасці жыхары Віленшчыны часта спасылаюцца на факты ўласнай біяграфіі: нараджэнне на тэрыторыі, што некалі ўваходзіла ў склад *польскай* дзяржавы[5]; навучанне ў *польскай* школе; спавяданне каталіцкай (г. зн. „*польскай*”) рэлігіі і г. д. У асобных выпадках апелююць да свайго генетычнага паходжання, даводзячы, што палякамі былі іхнія бацькі і дзяды.

(Хто тут жывуць?) Тут пал́які, пал́які. (А чаму палякі?) Патаму шта палякі. (Ну то як эта?) Ну када-та тут Польшча была[6] (в. Кена, Віленскі р-н, мужчына, 1930 г. н.) (AIMEF, 3, s. 7).

(То як Вашыя бацькі былі палякí ці?..) Пал́які. (А Вы самі кім лічыцеся?) Палякí, дакумэнты, усё (в. Жлоўкты, Салечніцкі р-н, мужчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 2, s. 90).

Усе палякамі пісаліся. […] Я, ныпшыклад, я ж радзілася ў дваццаць чацьвёртым, а Польска была... Я шэсьць клясаў, пака вайна, скончыла. Гэтай... Польскей школы. Польскія школы былі. Пака савецкая власьць не прышла. Там многа, ужо маладзёж уся гаварыла па-польску (мяст. Рукойні, Віленскі р-н, жанчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 1, s. 90).

4 Гэтае і іншыя пытанні функцыянавання польскай ідэнтычнасці ў беларуска-літоўскім памежжы падрабязна разгледжаны ў працах Д. Даўкшаса (2008; 2012; 2015) і В. Вішняўскаса (2020).

5 Асабліва, калі гэта пацвярджаецца афіцыйнымі дакументамі, г. зн. юрыдычнымі „сведчаннямі” сваёй грамадзянскай, а значыць, у вачах інфармантаў, і этнічнай ідэнтычнасці.

6 Тут і далей намі вылучаны словы, якія прыводзяцца ў якасці аргументаў свайго этнічнага статусу.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



(А кім ужо шчыталі сябе: палякамі ці беларусамі?) Паля́камі. А как жа? (А чаму палякамі? Па-беларуску гаворыце ж?) Ну пачаму? Мы ў польскай школе ўчыліся, і па-польску чыталі, і пісалі. І всё. І па-польску і гаварыць можам. І гаварым па-польску. І па-руску, і па-беларуску гаварым. Всяк! (мяст. Рукойні, Віленскі р-н, жанчына, 1927 г. н.) (AIMEF, 1, s. 6).

(Чаму палякі называюцца, а не беларусы? Ці літоўцы?) Чаму?.. Дык ёсьць касьцёл. Да касьцёла ходзяць. Відзіця, вун касьцёл? Каля замка. (А бацькі вашыя хто – палякі ці?..) Палякі́. (А па-польску ўмелі?) Яны не ўмелі. Па-просту і па-просту гаварылі. (А ў вёсцы таксама па-просту?) Па-просту. Во так. Я троха ўмела па-польску, але забыла (мяст. Меднікі, Віленскі р-н, жанчына, 1950 г. н.) (AIMEF, 1, s. 27).

Пры гэтым неабходна падкрэсліць, што інфарманты, якія гавораць „па-просту”, схільныя ідэнтыфікаваць сваю мову як беларускую, але не як „правільную”, „чыстую” (г. зн. літаратурную, нармаваную, афіцыйную), я як мяшаны з іншымі – польскай, рускай і нават літоўскай – выключна гутарковы варыянт мясцовай мовы.

(А тут вот як жыўшы – палякі шчытаюцца там, літоўцы жылі ці?..) Палякі. (Палякі?) Палякі, але яны і па-просту гавораць. Яны і так палякі па-польску не ўмеяць. Некаторыя гавораць, але не надто так умеяць. (То а просты язык – эта які?) Просты язык. Ну, пахожы да беларускаго, но алі не такі троха. (Але падобны?) Але падобны. (в. Чапурнішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1933 г. н.) (AIMEF, 4, s. 30).

(Скажыце, вот у вёсцэ гаварылі па-просту, па-польску чы?..) І па-польску некатарыя. Ну, у нас у вёсцэ то па-польску не надта гаварылі там многа хто. Па-просту. Вот так, як мы тэраз гаворым. (А вот эты просты язык – эта які язык?) Ну, вот такі просты язык. На беларускі пахожы (в. Янулішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1930 г. н.) (AIMEF, 5, s. 32).

Ну так у нас такі язык, жэ і просты, ну і беларускі. Мяшаны в обшчэм. Мяшаны тутай (в. Пятрулішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 5, s. 60).

(Так, а ў вёсцы ў вас як гавораць?) Па-просту. Таксама як і я гавару. (А як гэта?) Палякі́ так. Па-просту гавораць. (Па-просту?) Па-просту. (А што значыць – „па-просту гаварыць”? Гэта як? Па-польску ці па-беларуску?) Эта па-баларуску. (Па-беларуску?) Да. (Так вы па-беларуску гаворыце?) Я гавару па-баларуску. (А па-польску ці ўмееце?) Слаба я ўмею (мяст. Меднікі, Віленскі р-н, жанчына, 1950 г. н.) (AIMEF, 1, s. 27).

Эта ж па-просту. Вот я і шчас па-просту [гавару]. Эта значы такі вот… Размова такая, што вот, как беларуская такая. Ана ні беларуская, а прастая. Проста так вот. Самадзельная такая размова (в. Адамчукі, Віленскі р-н, мужчына, 1937 г. н.) (AIMEF, 4, s. 78).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



> Мы шчытаемся палякі, але гаворым так па-беларуску пачці. (Ну а як гэта? Па-простаму ці што?) Ну так па-простаму (в. Слабада, Віленскі р-н, жанчына, 1936 г. н.) (AIMEF, 4, s. 116).

> А нашы, нашы язык вот такі вот. Ні то беларускі, ні то польскі. З Польшчы прыяжджаяць – гаворым па-польску, з Беларусі – па во так па-прастому (в. Пятрулішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1933 г. н.) (AIMEF, 5, s. 52).

> А тут такі народ мéшаны. Мяшáны народ. Што я... Што я па-польску разгаварываю? Я па-польску ўмею. Па-беларуску ўмею. Прастой народ тут. Просты. Просты язык (в. Кена, Віленскі р-н, мужчына, 1930 г. н.) (AIMEF, 3, s. 7).

Такім чынам, у адрозненне ад нацыянальных моў, „простая мова" указвае ў памежным рэгіёне не на канкрэтную нацыянальнасць чалавека, а на яго сялянскую („простую") ідэнтычнасць, якая сваімі каранямі сягае ў дамадэрны (данацыянальны) перыяд.

## „Простая" ідэнтычнасць як сацыяльны стыгмат

Скрайне нізкі прэстыж беларускай мовы, звязаны, у тым ліку, з адсутнасцю (як у мінулым, так і ў сучасным) яе паўнавартаснай прадстаўленасці ў такіх важных для local community сацыяльных інстытутах як дзяржаўныя ўстановы, адукацыя, касцёл або царква, ва ўмовах дамінавання палітычна канкурыруючых у паўднёва-ўсходняй Літве этнічных статусаў палякаў і літоўцаў ды панавання рускай мовы ў Беларусі прыводзіць да свайго кшталту стыгматызацыі сельскіх жыхароў, што размаўляюць „па-просту"[7]. Падобна нарвежскім саамам, апісаным Г. Эйдхеймам (Eidheim, 1969), у публічных сферах, якімі з'яўляюцца, напрыклад, прыгарадны аўтобус, мясцовы касцёл ці магазін, яны ўсімі сіламі імкнуцца схаваць сваю „простую" ідэнтычнасць.

> Мы па-просту ў хаце гаварылі. Там была Беларусь, па-просту гаварылі. А сюда прыйшла [замуж], мусіла па-польску [навучыцца гаварыць]. Бо тут едуць зь Вільні з аўтобусам – мне ўжо стыдна, мусіла па-польску (мяст. Тургелі, Салечніцкі р-н, жанчына, 1923 г. н.) (AIMEF, 3, s. 26).

[7] У маладога пакалення мясцовых жыхароў, якія, як правіла, у адрозненне ад сваіх бацькоў, ужо валодаюць некалькімі (літоўскай, польскай і рускай) мовамі, у якасці своеасаблівага стыгмату ўспрымаецца недасканалае іх веданне і актыўнае змешванне рознамоўных элементаў (Šliavaitė, 2015, s. 35).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Ну, так ужэ тут і ў нас больша прынята. Эта в автобусе больша там па-польскі разгаварівают, там гдзе-та там так, а между сабой – там как папала, там сказал слова польскае, слова простое там (в. Янулішкі, Віленскі р-н, мужчына, 1957 г. н.) (AIMEF, 5, s. 28–29).

(А ў сям'і ў вас гаварылі бацькі як? Па-просту, па-польску?) Па-просту. І па-польску як трэба. Ну па-польску, дык гэта там ужо, як у Вільні. Там. А так… (в. Жэмайтэлі, Віленскі р-н, жанчына, 1936 г. н.) (AIMEF, 4, s. 6).

Бо як ужо ў горадзе – па-польску, па-літоўску разгаваруяць, а на дзярэўне – па-просту (в. Слабада, Віленскі р-н, жанчына, 1935 г. н.) (AIMEF, 4, s. 135).

Усе вот па такому, па-простаму разгаваруяць. А хто там ужо, ні знаю, да касцёла ідзём, у касцёл – так ужо па-польску ў нас (в. Сіруцішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1925 г. н.) (AIMEF, 3, s. 26).

Палякі вот так. В касцеле, там гдзе па-польску. Чы вот як раньша было: куда гдзе-нібудзь – так всё па-польску ішло. Тэраз бывае между сабой так в горадзе там ужо па-польску разгаварываяць. Да дзяцей малых па-польску гаварылі. (Ну а ў сям'і то ўжо так больш па-просту?) Па-просту большэ. Рэдка хто гаварыў па-польску. Там пару хат гдзе-нібудзь. А шчыталіся і пісаліся палякі все тут (в. Бурнішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1921 г. н.) (AIMEF, 4, s. 26).

Такім чынам, прэзентацыя „простай” ідэнтычнасці мясцовымі жыхарамі ў публічнай сферы з'яўляецца недапушчальнай.

Як вядома, яшчэ ў XIX ст. на вяршыню іерархіі мясцовых моў сярод каталіцкага насельніцтва зямель былога ВКЛ была змешчана польская як прэстыжная мова сацыяльнай эліты, рэлігіі і адукацыі. У нашы дні стэрэатып пра яе выключную „культурнасць” і „цывілізаванасць” (у дачыненні не толькі да беларускай, але і да літоўскай мовы) працягвае бытаваць у першую чаргу сярод старэйшага пакалення мясцовых палякаў, схільных разглядаць беларускую мову як мову „другога гатунку”. Прывядзём паказальны прыклад размовы з адным з інфармантаў на тэму якаснай ацэнкі „простай” мовы:

Знаеця, как эта гаварылі? Во такім прастым... Па каком-та такім, я ні знаю, языку. (А на што больш падобны?) Он болей... Часць хватаіцца, наверна, какова... Бальшынство то, хіба, к рускаму он языку надаецца. Але падобны часць, можа, беларускаго хваталася. Во такі нізграбны, нікрасівы язык. Панімаеце? Вот как рускі, так рускі гаворыш, как эта ўжо панімаецца і чуствуецца, што вот ты па-руску. Ілі па-польску. А эты такой язык. [...] (А паміж сабой вось так па-гэтаму, па-просту?..) Такім во тожа языком... чага́цкім! Ізвініце за выражэнія. Такой язык. Ну знаіця, ніхарошы (в. Гейбулі, Віленскі р-н, жанчына, 1944 г. н.) (AIMEF, 3, s. 135).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Відавочна таксама, што само вызначэнне „простая” (г. зн. нескладаная, звычайная, шараговая) супрацьпастаўляе гэтую мову больш складаным, фармальным мовам, якія маюць афіцыйны статус. Такімі мовамі у сучасным кантэксце паўднёва-ўсходняй Літвы з’яўляюцца польская і літоўская мовы, у цяперашняй Беларусі – пераважна руская.

Варта адзначыць, што практыка выкарыстання польскай мовы як сродку самаідэнтыфікацыі характэрна і для палякаў, якія гавораць „па-просту”. Гэта, у прыватнасці, выяўляецца ў актыўнай вонкавай дэманстрацыі элементарнага валодання польскай мовай самімі жыхарамі, якія ў хатнім побыце размаўляюць „па-просту”, як сімвалічнай маніфестацыі сваёй польскай ідэнтычнасці. Пры гэтым маркіруючае значэнне мае нават веданне ўсяго некалькіх фраз або слоў на польскай мове. Напрыклад, у час размовы з намі інфарманты пастаянна намагаліся праілюстраваць сцверджанне пра сваю прыналежнасць да польскай этнічнасці веданнем і дэкламацыяй вывучаных яшчэ ў дзіцячым узросце малітваў, вершаў, песень на польскай мове. Даволі тыповай праявай дэманстратыўнай „польскасці” вясковым насельніцтвам беларуска-літоўскага памежжа ў недалёкім мінулым таксама можна лічыць выкананне мясцовага песеннага фальклору на польскай мове.

> Лалоўнікі хадзілі. Пад вокны прыходзілі спявалі. „Васолы нам дзісь дзень настаў”. Але па-польску ў нас спявалі. У нас не спявалі ні па-беларуску, ні па-руску, а па-польску спявалі (в. Юзафова, Віленскі р-н, жанчына, 1928 г. н.) (AIMEF, 5, s. 18).

У асобных выпадках у якасці аргумента іх этнічнага статусу маглі называцца нават „польскія” (г. зн. каталіцкія) імёны або прозвішчы.

Такім чынам, для каталіцкага насельніцтва Віленшчыны, што гаворыць „па-просту”, у залежнасці ад сітуацыі публічнага ўзаемадзеяння дастаткова дэкларраванага, часта цалкам сімвалічнага ведання польскай мовы, каб ператварыць яго ў сродак выражэння сваёй польскай (не „простай”) ідэнтычнасці.

## Тэрыторыя паходжання як маркер ідэнтычнасці

Важная характарыстыка „сваіх” – гэта агульнасць тэрыторыі. Навакольныя мясціны і населеныя пункты, якія эпізадычна даводзілася наведваць нашым інфармантам, у іх свядомасці злучаюцца ў цалкам вызначаную і выразна акрэсленую тэрыторыю. Прычым гэта тычыцца не толькі жыхароў паўднёва-ўсходняй Літвы, але і ўраджэнцаў суседніх раёнаў Беларусі (Vyšniauskas, 2020, p. 89).

Тэрыторыя паходжання ва ўмовах няпэўнасці моўнай ідэнтыфікацыі ў памежжы часцей за ўсё агучваецца ў якасці адказаў на пытанне аб этнічнасці. Тэрытарыяльная прыкмета, якая адлюстроўвае элементарную прасторавую дыхатамію „тут-там”, цесна звязаную з супрацьпастаўленнем „мы-яны”,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



прыводзіцца як этнавызначальная ў розных кантэкстах: дзяржаўна-палітычным, лакальна-рэгіянальным, гістарычным.

> (Так а беларусы дзе ўжо жывуць самі?) Беларусы ад нас тут недалёка. (А дзе?) Ужо за Меднікамі. Вот ужо там [за граніцай]. (А там Беларусь ужо?) Да. Там ужо Беларусь. (А літоўцы тады дзе жывуць?) Ну, граніца беларуска-літоўская. Тут. (Але гэта таму што ў дзяржаве жывуць? У Літве?.. То таму літоўцы?) Так літоўцы ў Каўнасе жывуць! Там у этых... Там у Літве. Да́лей там ужо – разныя там дзярэўні і гарада. (А тут яшчэ не Літва шчытаецца?) А тут яшчэ не Літва. Тут палякі жылі раней. Тут былі палякі. А літовцы толька прыезжыя каторыя (мяст. Рукойні, Віленскі р-н, жанчына, 1927 г. н.) (AIMEF, 1, s. 12).

З улікам атрыманых адказаў інфармантаў, можна вылучыць некалькі ўмоўных схем адрознівання, пабудаваных на гэтай прыкмеце.

### *Адрозніванне літоўцаў „з Літвы" і мясцовых палякаў*

Нягледзячы на тое, што жыхары Віленскага і Салечніцкага раёнаў з'яўляюцца грамадзянамі сучаснай літоўскай дзяржавы, многія з іх гістарычна ўспрымаюць Літву як сімвалічную тэрыторыю на захадзе ад Вільні („недзе пад Каўнасам"), па сутнасці атаясамліваючы яе з Літоўскай Рэспублікай 20-30-х гг. XX ст.

> Як я нідзе далей Вільна... Я ездзіла. І ў Польшч ездзіла, то там па-польску гаварылі. І на Беларусь ездзіла. Ну, на Літве, так як эта Літва там ёсць далей, я там ні разу ні была на гэтай Літве. Кайшадэрыс там, гэны там Каўнас. Там этыя іхныя рэспублікі. То я там, ні скажу, ні была (в. Юзафова, Віленскі р-н, жанчына, 1928 г. н.) (AIMEF, 5, s. 20).

> (Ну а літвіны́ то ўжо дзе тады жывуць?) Літвіны́ ёсць пара штук у нас. (Ну яны наезныя ці як?) Да. Тут пажаніўшыся. Во хата. Літовец узяўшы. Прышоўшы сюда літовец. (Так а няма тутэйшых, каб тут жылі такія даўней?) Літоўцаў ту... (Не было?) Не. (А дзе тут бліжэйшыя такія вёскі?) Ну дзе бліжэйшыя тутака? Там ужо пад Каўнасам. (Пад Каўнасам?) Да, я быў (в. Кена, Віленскі р-н, мужчына, 1930 г. н.) (AIMEF, 1, s. 7).

> Літвякоў ні было, ні было. Толька бывае, знаеце, жаніліся. Калісьці ж не так, як тэраз жэняцца. Павязуць у сва́ты. Ну то бралі і з Літвы. Так некаторыя во ўмелі жэншчыны па-літоўску (мяст. Малыя Салечнікі, Салечніцкі р-н, жанчына, 1932 г. н.) (AIMEF, 2, s. 45).

> Літвякі́ ў сябе жылі. А потым тэж да Вільні прышлі (в. Жлоўкты, Салечніцкі р-н, мужчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 2, s. 91).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Мясцовыя палякі як бы ўвязваюць іншыя этнічнасці з аддаленымі ўскраінамі гістарычнай Віленшчыны, калі літоўцы жывуць дзесьці „у глыбіні Літвы", а беларусы – у „сваёй" дзяржаве на ўсходзе[8].

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што рэгіянальная ідэнтычнасць здольная збліжаць і звязваць пражываючых тут людзей у адзінае цэлае, незалежна ад іх этнічнай прыналежнасці. Нават розныя мовы не перашкаджаюць людзям разумець адно аднаго, калі яны жывуць на агульнай тэрыторыі і маюць агульны досвед (Kozłowska-Doda, 2021). У прыватнасці, шлюбы паміж жыхарамі гэтай тэрыторыі лічацца шлюбамі паміж „сваімі". Паказальнае ў гэтым плане таксама якаснае адрозненне стэрэатыпа мясцовых, г. зн. „сваіх" літоўцаў, якія гістарычна пражываюць па суседству з палякамі і беларусамі Віленшчыны, ад стэрэатыпа „акаянных", „заядлых", „чыстакроўных" літоўцаў – выхадцаў з іншых этнаграфічных рэгіёнаў Літвы (Vnukovìč, 2012, s. 34–35; Unukovičius, 2014, p. 194).

## *Адрозніванне „чыстых" (што жывуць у Польшчы) і мясцовых палякаў*

Асэнсаванне адрозненняў (найперш моўных) паміж палякамі, што жывуць у Польшчы, Беларусі і Літве, прывяло да фарміравання стэрэатыпа „чыстага" паляка, своеасаблівы эталон якога, як правіла, лакалізуецца ў самой Польшчы.

> (Скажыце, а гэтыя месныя палякі, ці адрозніваюцца яны ад тых ужо палякоў, што з Польшчы?) Тут другі разгавор. У нас тут, у нас Віленшчызны разгавор па-польскі. А там ужо чысты акцэнт. Ну Польшч вазьмі, мазуры гавараць па-аднаму, вазьмі там, ежэлі пад Вроцлаў, там ужо ў месных другі разгавор (в. Жлоўкты, Салечніцкі р-н, мужчына, 1934 г. н.) (AIMEF, 2, s. 85).

> (А як ужо „чысты" паляк, з Польшчы прыедзе, ці ён такі самы?..) Былі прыехаўшы старушкі, тут дзе-та жыўшы, значы. Ну як началі́ гаварыць, другі раз і ні поймеш, што яна скажа. Ест і ў Польшчы радні нашай. Но мы ні разу ні ездзілі (в. Гейбулі, Віленскі р-н, мужчына, 1942 г. н.) (AIMEF, 3, s. 23).

У некаторых выпадках на вяршыню іерархіі рэгіянальных тыпаў палякаў інфарманты ставілі саміх сябе, г. зн. менавіта палякаў Віленскага краю. Падобны аўтастэрэатып, відаць, быў сфарміраваны мясцовай польскай інтэлігенцыяй яшчэ ў XIX ст.

> (А ўжо ад „чыстага" паляка чым атлічаецца месны паляк? Як ужо з Варшавы прыедзя? Варшавяк?) Я січас скажу. Так вот чыстыя паля́кі лічы ся как раз на Віленшчы́зне!

[8] Пра гэты і іншыя аспекты канструявання „свайго краю" палякамі Салечніцкага раёна, гл. артыкул В. Вішняўскаса (2020, p. 91).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



> Более крэпкіх палякаў на Вісле нету і не сушчэствует! Вот здзесь паля́кі настаяшчые! А там втарова сорта, так сказаць... (А чым яны ўжо атлічаюцца?) Ну... Можэт і харакцер (мяст. Тургелі, Салечніцкі р-н, мужчына, 1959 г. н.) (AIMEF, 2, s. 24–25).

Так ці інакш, адна і тая ж назва „палякі", прывязаная да розных тэрыторый, аказваецца напоўненая розным зместам.

### *Адрозніванне „беларусаў" і мясцовых палякаў*

Бадай адзіным сімвалічным маркерам адрознасці палякаў, якія гавораць „па-просту" і ў наш час жывуць па абодва бакі беларуска-літоўскай мяжы, выступае іх грамадзянская ідэнтычнасць. Ярлык „беларус" аўтаматычна прымацоўваецца да чалавека, які пераехаў з тэрыторыі Беларусі ў суседні раён Літвы, нават калі ён сам лічыць сябе палякам. Гэтаксама найменне „літовец" прыстае да любога (нават нелітоўскай нацыянальнасці) чалавека, што прыехаў з Літвы ў Беларусь. У гэтым выпадку этнічная намінацыя абумоўлена грамадзянскай прыналежнасцю чалавека, што сведчыць пра залежнасць вонкавай этнічнай катэгарызацыі ад змен палітычна-адміністрацыйных меж:

> Беларусы́. Граніца тут ад Шумска. Там граніца. [Там] беларусы́ (в. Кена, Віленскі р-н, мужчына, 1930 г. н.) (AIMEF, 2, s. 7).

> (А беларусы ці ёсць?) Ест. Во, дзе капліца, там з Беларусі кобета. Там хата друга з Беларусі. З гэтых там... З Рукшаньцаў, там з Рымуняў (в. Гейбулі, Віленскі р-н, мужчына, 1942 г. н.) (AIMEF, 3, s. 22).

> (А счытаюцца – палякі, беларусы?) Палякі. В аснавном тут все. Беларусы тут, наверна, наврат лі адзін-два, еслі тока есць, каторые з Беларусі прыехавшы, то лі замуж вышлі, жаніліся (в. Янулішкі, Віленскі р-н, мужчына, 1957 г. н.) (AIMEF, 5, s. 28).

> (А хто тут у вас, скажыце, жывуць? Палякі́ ці беларусы́? Ці хто?) Ну тут палякі́. (А літвіноў, беларусаў – тут як?) Беларусы – туда. Туда дальшэ. Туда за граніцу. Мы тут – пагранічная зона. (Пагранічная зона?) Да. Ну шчытаемся літоўцы. (Вы літоўцы шчытаецеся?) Ну да! Ну как жэ? Літва! (Не. А вы самі как?) Я – полька! (Полька?) Да. Я – полька. (А беларусаў ці было тут дзе?) Тут німа ў нас беларусаў. (А літоўцы?) А літоўцы... І літоўцаў. Ну знаеце, цяпер маладыя ўсе ўмеяць па-літоўску гаварыць (в. Віндзюны, Віленскі р-н, жанчына, 1940 г. н.) (AIMEF, 3, s. 42–43).

> (А як тут гаворaць?) Ну так, як і я гавару – па-прамой. Па-просту. Так, як я на Беларусі, так і тут. (Ну а жыве тут хто? Як шчытаяцца – палякі ці?..) Палякі. Шчытаяцца. І мы палякі шчытаемся. Усе палякі. (А гаворaць – па-просту?) Па-просту разгаварыюць. А ўжо, як дзеці ў Вільні жыюць, так яны па-польску. (Так а па-просту – эта як? То як шчытаецца –

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



па-руску ці па-беларуску?..) Гэта… Ну тут шчытаецца яны па-свойму гавораць, а мяне шчытаяць па-беларуску. А я з Беларусі (в. Слабада, Віленскі р-н, жанчына, 1935 г. н.) (AIMEF, 4, s. 135).

У той жа час трэба заўважыць, што нашы інфарманты пастаянна гавораць пра адсутнасць якіх-небудзь яўных адрозненняў паміж людзьмі, якія жывуць па *той* і *гэты* бок дзяржаўнай мяжы, нібыта імкнучыся растлумачыць субяседніку, што мяжа, якая з’явілася тут аднойчы, не зрабіла іх раптам колькі-небудзь адрознымі.

(А скажыце, тут вот як – па-просту гаварылі ў вёсцэ, па-польску?) Па-просту, па-просту ўсё. Усё па-просту. Тут усё па-просту. (А як гэта паняць па-просту?) Ну, так вот такі язык, такі во. Ну, мы гаворым. Вы які – літовец? (Не, я з Беларусі.) А! З Беларусі. Ну, так такі самы на Беларусі [язык]. Там палякі́ ёсь і якія там хочаш ёсь людзі. Там этыя беларусы, там такія самыя на Беларусі тожа там. Тое самае што і тут (в. Пятрулішкі, Віленскі р-н, мужчына, 1935 г. н.) (AIMEF, 5, s. 56).

(То а якая розніца, скажыце, вот беларус і паляк? То ці ёсць якая розніца? Што тутэйшыя беларусы і палякі? Як іх ужо пазнаць?) Якая там разніца! У мяне радня во ў Рукшанях ест, там у Палушы, в Астраўцы ёсць, жывуць радня. Тока што пераехаць нівазможна. (То а гавораць адзінакава?) Ну так у нас таксама: „паехаў”, „пайшоў”, „ты”... (в. Гейбулі, Віленскі р-н, мужчына, 1942 г. н.) (AIMEF, 3, s. 23).

(А то чым ужо палякі ад беларусоў адрозніваюцца? Як пазнаць?) А што там пазнаць? Як граніцы не было, езьдзілі – то сама, што і тут. Бінягоні, Варанова. Там мой брат на Беларусі. Паляцкі́шкі, знаеце? (Паляцкішкі знаю.) Ажаніўшыся там. А дачка тут у Ма́лых Сале́чніках ажанілася. А ён там з Беларусі. (То чы адрозніваюцца беларусы ад палякаў?) А што там адрозніваецца? (Ці ёсць якая розніца? Як вот пазнаць чаму?..) Розніцы няма. З кім зышоўся, з тым і гаворыш (в. Жлоўкты, Салечніцкі р-н, мужчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 2, s. 91).

Жыхары, што пераехалі ў Літву з суседніх раёнаў Беларусі, дакладна гэтаксама канстатуюць поўную адсутнасць якіх-небудзь заўважных культурных, моўных і рэлігійных адрозненняў паміж мясцовым насельніцтвам.

(Ну вот тутэйшыя палякі, што на Літве, ці адрозніваюцца? Вот вы прыехалі там, кажыце, з Беларусі? Ці якая розніца ёсць – што тут жывуць, што там?) Не-а. Німа нікакой разніцы. (Можа гаворка такая ўжо другая?) Адно то сама. (То сама?) Адно то сама (в. Сіруцішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1925 г. н.) (AIMEF, 3, s. 32).

### *Адрозніванне мясцовых беларуска- („проста-”) і польскамоўных палякаў*

І, нарэшце, можна вылучыць яшчэ адно ўмоўнае тэрытарыяльнае адрозніванне – дзвюх кампактна пражываючых у паўднёва-ўсходняй Літве груп беларуска-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



і польскамоўных палякаў[9]. Інфарманты, так ці інакш, падмацоўваюць свае расказы пра моўныя адрозненні мясцовых палякаў адпаведнымі прасторавымі апісаннямі з характэрным супрацьпастаўленнем „тут” і „там”. Аднак, пры гэтым ні моўная, ні тэрытарыяльная дыстанцыя не ставяць пад сумненне прыналежнасць і тых, і іншых да адной этнічнай катэгорыі.

> А вот ужо ў **тую старану** пад Э́йшышкі, пад Вільнюс – ужо **там** па-польску гавораць. То **там** па-польску гавораць. Ест і **тут** такія радзіны, што гавораць па-польску. Ест такіх (мяст. Малыя Салечнікі, Салечніцкі р-н, жанчына, 1932 г. н.) (AIMEF, 2, s. 45).

> (Так а людзі тут па-просту гавораць ці па-польску? Як?) Ай... **Тут** няма польскаго языка. (А дзе ўжо па-польску гавораць?) Ну так у нас, як **там** во была я, у Бабінцах я жыла, так **там** у нас былі Буйвідзкаго калхоза. Так **там** па-польску гаварылі. А **тутай** – **тут** не. **Тут** усе па-просту, па-просту. Па-руску. А тэраз, веш, людзі памяшаныя, размаітыя. **Ту** во наехала. **Тут** невядома скуль наехаўшы этых людзей. **Тут** няма ні аднаго этаго лаварскага чалавека. […] (А ў сям’і ў вас як гаварылі? Вот у дзяцінстве? Па-просту ці па-польску?) Дзе? (Ну там у вас.) У нас і па-просту гаварылі. І па-польску гаварылі. А ўжо **там** у Буйвідзі – то **там** ваабшчэ тыко па-польску гаварылі. […] **Там** усе па-польску гаварылі, а **тутай**... А **ту** ўсе па-просту! (мяст. Лаварышкі, Віленскі р-н, жанчына, 1925 г. н.) (AIMEF, 1, s. 49–50).

Такім чынам, тэрыторыя адыгрывае вельмі важную ролю ў маркіраванні шматузроўневай ідэнтычнасці насельніцтва памежнага рэгіёна. Яна здольная як падзяляць, так і аб’ядноўваць „сваіх” і „чужых”, уключаць і выключаць людзей у тыя або іншыя этнічныя катэгорыі, суаднесеныя з сімвалічнай прасторай іх паходжання.

## Казус *тутэйшасці*

Асобна неабходна спыніцца на паняцці „тутэйшыя”. У самім гэтым тэрміне, якім часта абазначаюць карэнных, пераважна славянамоўных жыхароў паўднёва-ўсходняй Літвы, закладзена ідэя вызначэння этнічнасці паводле месца[10]. Варта падкрэсліць, што гістарычна гэтае паняцце выкарыстоўвалася значна шырэй – у дачыненні амаль да ўсяго насельніцтва Беларусі з размытай этнічнай самаідэнтыфікацыяй (Pershai, 2008).

[9] Па-беларуску гавораць галоўным чынам вясковыя жыхары на поўдзень ад ракі Віліі (ваколіцы Лаварышак, Тургеляў, Рукойняў, Табарышак, Яшунаў і інш.), па-польску – на поўнач ад яе (ваколіцы Немянчына, Буйвідзяў, Падброддзя, Падбярэззя, Дукштаў і інш.).

[10] У сучаснай Літве гэтае паняцце нярэдка прыцягваецца для канструявання лімінальнай этнічнасці, якая быццам займае прамежкавы стан паміж палякамі, беларусамі і літоўцамі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Не будзе перабольшваннем сцвярджаць, што ў сучасным літоўскім дыскурсе запазычанае слова-калька *tuteišas* (параўн. бел. „тутэйшы" і польск. „tutejszy"), асабліва калі яно падкрэслена наўмысна выкарыстоўваюцца замест уласна літоўскіх слоў *čiabuvis* „мясцовы, сталы жыхар" ці *vietinis* „мясцовы", па сваім значэнні набліжаецца да паняццяў *inlanders*, *natives* і *indigènes*, якія Б. Андэрсан разглядаў на галандскім, англійскім і французскім каланіяльных прыкладах адпаведна. Гэта значыць, што людзі, якія выступаюць пад гэтымі назвамі, з'яўляюцца „ніжэйшымі" і „тутэйшымі" (Anderson, 2006, s. 122–123), г. зн. прыпадабняюцца „туземцам" з больш нізкім сацыяльным статусам. Гэта, дарэчы, добра тлумачыць той факт, чаму далёка не ўсе цяперашнія жыхары Віленшчыны гатовыя пазнаваць сябе пад гэтай папулярнай этыкеткай (Vyšniauskas, 2020, s. 94), адзначаючы яе вонкавы, грэблівы і нават абразлівы характар.

> (А Вы „тутэйшыя" – гэта як значыць? Тутэйшыя?..) Эта так літоўцы нас назвалі [смяецца]. (Літоўцы? А самі так не называецеся?) Не. (А самі як? Палякі?) Палякі. (А чаму палякі?) Патаму што палякі (мяст. Тургелі, Салечніцкі р-н, мужчына, 1959 г. н.) (AIMEF, 2, s. 24).

> Тутэйшыя, як некалі гаварылі ўсё, што тутэйшыя. Было эта. Ну тута ж пры граніцы недалёка. Недалёка эта граніца (мяст. Меднікі, Віленскі р-н, жанчына, 1932 г. н.) (AIMEF, 5, s. 5).

Іншымі словамі, тэрмін „тутэйшыя", што замацаваўся ў якасці ярлыка-абазначэння карэннага славянамоўнага насельніцтва паўднёва-ўсходняй Літвы, практычна не выкарыстоўваецца мясцовым насельніцтвам ў якасці саманазвы. У той самы час гэта ніяк не перашкаджае яму усяляк дэманстраваць „тутэйшасць", „карэннасць", „спрадвечнасць", закліканую абгрунтоўваць свае правы на мясцовыя рэсурсы і прывілеі[11].

Варта таксама адзначыць, што тэрмін „тутэйшы" можа выкарыстоўвацца ў памежжы не толькі ў дачыненні да беларускамоўных, але і да польскамоўных палякаў, а таксама да літоўцаў (галоўнае, чалавек павінен нарадзіцца недзе ў гэтай мясцовасці) (Vyšniauskas, 2020, p. 83). Аднак найчасцей усё ж такі ён прыцягваецца для агульнага абазначэння карэннага насельніцтва з невыразнай самаідэнтыфікацыяй, якое размаўляе „па-просту".

## Рэлігія як прыкмета этнічнасці

Яшчэ адным базавым маркерам, што нярэдка выкарыстоўваецца для распазнання этнічных груп у памежным рэгіёне, выступае рэлігія, якая мае

[11] Напрыклад, прыналежнасць да карэнных павялічвала сацыяльны капітал групы за кошт закона аб рэстытуцыі, які забяспечваў ім вяртанне зямельнай уласнасці ў прэстыжным сталічным рэгіёне Літвы.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



важнае значэнне найперш для адрознівання палякаў і літоўцаў, з аднаго боку, і беларусаў, з другога.

Літоўцы і палякі (як тыя, што размаўляюць па-польску, так і тыя, што размаўляюць „па-просту”) паводле веравызнання пераважна каталікі, што абумоўлівае іх падобныя рытуальныя практыкі[12]. Напрыклад, нагляднай штогадовай праявай канфесійнага адзінства літоўска- і славянамоўнага каталіцкага насельніцтва ўсходняй Літвы і заходняй Беларусі ў мінулым былі паломніцтвы, якія здзяйсняліся ў Віленскую Кальварыю, дзе этнічная ідэнтычнасць артыкулявалася пераважна на падставе моўнай адметнасці.

Іншая сітуацыя склалася ва ўсходняй частцы Віленшчыны – гістарычнай зоне кантактаў паміж католікамі і праваслаўнымі. Тут каталіцызм традыцыйна разглядаўся як „польская вера”, у той час як праваслаўе – „руская” або „беларуская вера”. Нядзіўна, што ў гэтай зоне канфесіёнімы „католік” і „праваслаўны” аказаліся ўключаныя ў сістэму этнічных намінацый.

> (Але вы сябе шчыталі кім вот у дзяцінстве? Беларусы, палякі? Ці рускія?) У нас так: да вайны было – мы палякі лічыліся, после вайны – сталі беларусы. Пераменавалі нас. Вайна многа што ізмяніла. Нада казаць так, як ёсць. (А самі сябе? Вот як вы думалі? Вашыя бацькі кім самі сябе называлі?) Католікі. (Католікі?) Да. Хадзілі ў касьцёл. Касьцёлы былі ў нас. А после пазакрывалі многія. (А нацыі якой?) Каталічыскай. (Каталічыскай?) Да (мяст. Лаварышкі, Віленскі р-н, жанчына, 1917 г. н.) (AIMEF, 1, s. 58).

> У мяне муж быў очань такі працавіты. Ён хоць і рускі быў, але ён надта быў веруюшчы. Ён верыў у Бога. Ён верыў, усё. Ён казаў: „Бэз Бога – ні да парога!” (Так ён рускі скуль сам?) Ён з Валгаграда. (Ён праваслаўны быў?) Ну, мусі праваслаўны. Казаў, што праваслаўны. І тут мы з ім і шлюб бралі, і ўсё. (У касцеле бралі?) У касцеле. А как жа? У Лаварышках. У касцеле бралі. (Ён перахрысціўшыся быў ці як?) Ён тутака тады перахрышчываўся, ішоў на польскую веру. Ксёндз даваў нам шлюб і яго перахрышчываў, і ён быў як паляк. Ён дажа па-руску не гаварыў. Ён так, як і мы – вот па-просту і ўсё. І пацеры ўмеў гаварыць (в. Янулішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1930 г. н.) (AIMEF, 5, s. 31).

Нашы інфарманты, што спавядаюць каталіцызм, спасылаюцца на канфесійную прыналежнасць галоўным чынам пры неабходнасці абгрунтаваць этнічнасць беларусаў, якія, згодна з іх уяўленнямі, вызнаюць пераважна праваслаўе. Менавіта гэты маркер робіць размытую мяжу этнічнай групы беларусаў у вачах мясцовых палякаў больш выразнай і акрэсленай.

Сапраўды, праваслаўнае веравызнанне ў Літве даволі часта ўказвае на тое, што чалавек прыбыў з усходу, верагодна, з тэрыторыі цяперашняй Беларусі,

[12] Праўда, для палякаў Віленшчыны каталіцызм літоўцаў, якія ў далёкім мінулым былі „зацятымі паганцамі”, падаецца не зусім паўнавартасным і шчырым (Halemba, 1993).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



што, у свядомасці інфармантаў, аўтаматычна сведчыць пра яго „сапраўдную" беларускую этнічнасць.

> (Калі ўжо і палякі тут па-беларуску гавораць, а беларусы дзе жывуць?) Беларусы глыбей туды. Там праваславія болей. У нас усе каталікі былі. Туды, знаш, за Мядзельшчыну, там далей – там праваслаўныя. (Вілейка там?) Вялейка Старая. Там. Во Мядзельшчына. Мядзельскі раён. Увесь там гэты праваслаўны. Яны болей дзяржаліся (мяст. Рукойні, Віленскі р-н, жанчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 1, s. 19).

Такім чынам, падзел паводле прыкметы веры – „каталік-праваслаўны" – дапамагае жыхарам Віленшчыны ідэнтыфікаваць у першую чаргу беларусаў, якія пражываюць у суседніх раёнах Беларусі, аднак ён не з'яўляецца арганізацыйна рэлевантным для выбудоўвання этнічных меж паміж літоўцамі, палякамі і беларусамі-католікамі. Больш за тое, менавіта актыўная артыкуляцыя ў апошнія гады беларускай ідэнтычнасці апошніх, звязаная, перш за ўсё, з пераходам набажэнстваў у каталіцкай царкве Беларусі з польскай на беларускую мову, спараджае няўпэўненасць у развагах мясцовых палякаў аб адрозненнях паміж „нацыянальнасцямі" і „перашкаджае" ім спасылацца на каталіцызм як спецыфічны маркер выключна польскай і літоўскай этнічнасцяў.

> (А як пазнаць, што паляк, а што беларус? Розніца якая?) Як яго там пазнаіш? Па-руску гаворыць, тока еслі он прызнаіцца. Як пазнаіш, што ён хрысціянін, еслі жыгнаіцца па-польскі, па-хрысціянскі, то значыць – паляк. А беларусы яны ўжо маяць свой абычáй. Я во часта з Беларусі радыё настаўляла і Мінска слухаеш. Там ужо другія. Святой Гэлены касцёл. Як ксёндз моліцца, як там усё. (Па-беларуску?) Па-беларуску. (Сымона і Алены?) Ну. (Ці разумееце як ён?) Так эта я разумею (в. Пятрулішкі, Віленскі р-н, жанчына, 1924 г. н.) (AIMEF, 5, s. 60).

Да другасных дыякрытычных маркераў, што сітуацыйна ўдакладняюць і пацвярджаюць этнічнасць літоўцаў, палякаў і беларусаў, можна аднесці таксама сімвалічна значны фальклор, нацыянальны касцюм, адметныя традыцыі харчавання, народныя звычаі і абрады, пэўныя правілы паводзін, міфалогію і светапогляд, якія ў наш час існуюць пераважна ў дыскурсе, а не ў рэальным жыцці (г. зн. папросту з'яўляюцца дэклараванымі ўяўленнямі пра сімвалічныя каштоўнасці).

## Высновы

Такім чынам, да першасных прыкмет, на падставе якіх жыхары беларуска-літоўскага памежжа тлумачаць сваю і чужую этнічнасць, выбудоўваючы адпаведныя сімвалічныя межы, належаць мова, тэрыторыя паходжання і рэлігія.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Літоўцы выразна ідэнтыфікуюцца палякамі і беларусамі Віленшчыны, галоўным чынам, на падставе моўнай прыкметы. На польскую этнічнасць у гэтым рэгіёне таксама ўказвае мова, нават калі яна выкарыстоўваецца выключна сітуацыйна, пасіўна або дэкларатыўна, г. зн. як глыбока сімвалічны сродак выражэння этнічнай ідэнтычнасці. Аднак мова ў вачах жыхароў Віленшчыны практычна не арганізуе этнічную мяжу беларусаў, што значна абмяжоўвае арганізацыйны патэнцыял іх ідэнтычнасці і прымушае людзей дадаткова акцэнтаваць такія маркеры адрознасці, як тэрытарыяльная і канфесійная прыналежнасць. Пры гэтым у залежнасці ад сітуацыі міжэтнічнага ўзаемадзеяння адны і тыя ж людзі могуць выкарыстоўваць адны і тыя ж прыкметы для вызначэння этнічнасці зусім па-рознаму. Гэта чарговы раз сведчыць пра тое, што этнічныя межы, якія выбудоўваюцца ў выніку сацыяльных працэсаў уключэння і выключэння, заўжды рухомыя, эластычныя і зменлівыя.

## REFERENCES

**Sources**

AIMEF – Archiv Institute of Art History, Ethnography and Folklore named. Kondrat Krapiva of the National Academy of Sciences of Belarus [АІМЭФ – Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі]

AIMEF 1. (2007) – f. 23, vop. 7, spr. 5.

AIMEF 2. (2008) – f. 23, vop. 8, spr. 1.

AIMEF 3. (2009) – f. 23, vop. 9, spr. 5.

AIMEF 4. (2010) – f. 23, vop. 10, spr. 5.

AIMEF 5. (2011) – f. 23, vop. 11, spr. 3.

**Studies**

Anderson, Benedict. (2006). *Imagined Communities. Reflections on the Origin and Spread of Nationalism*. Revised Edition VERSO London–New York.

Barth, Fredrik. (1969). Introduction. In: Fredrik Barth (ed.). *Ethnic Groups and Boundaries. The Social Organization of Culture Difference* (pp. 9–38). Boston: Little, Brown and Company.

Baudouin de Courtenay-Ehrenkreutzowa, Cezaria. (1930). Kilka uwag i wiadomości o etnografji Województwa Wileńskiego. W: *Wilno i ziemia Wileńska: zarys monograficzny*. T. 1 (s. 173–218). Wilno: Wydawnictwo Wojewódzkiego Komitetu Regjonalnego.

Daukšas, Darius. (2012). Lietuvos lenkai: etninio ir pilietinio identiteto konstravimas ribinėse zonose. *Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos*, 12(21), pp. 167–193.

Daukšas, Darius. (2008). Pase įrašytoji tapatybė: Lietuvos lenkų etninio/nacionalinio tapatumo trajektorijos. *Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos*, 8(17), pp. 57–72.

Daukšas, Darius. (2015). Valstybės teritorialumas ir tautinės mažumos: Lenko kortos atvejis. *Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos*, 15(24), pp. 53–68.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Eidheim, Harald. (1969). When Ethnic Identity is a Social Stigma. In: Fredrik Barth (ed.). *Ethnic Groups and Boundaries. The Social Organization of Culture Difference* (pp. 39–57). Boston: Little, Brown and Company.

G.R. (1896). *Rasskazy o Litve i litovcah*. Moskva: Tipografiâ tovariŝestva I. D. Sytina. [Г.Р. (1896). *Рассказы о Литве и литовцах.* Москва: Типография товарищества И. Д. Сытина].

Grinblat, Mihail. (1959). K voprosu ob učastii litovcev v ètnogeneze belorusov. V: Susanna Tarakanova, Lûdmila Terent′eva (red.). *Voprosy ètničeskoj istorii narodov Pribaltiki: po dannym arheologii, ètnografii i antropologii* (s. 523–543). Moskva: Izdatel′stvo Akademii nauk SSSR. [Гринблат, Михаил. (1959). К вопросу об участии литовцев в этногенезе белорусов. В: Сусанна Тараканова, Людмила Терентьева (ред.). *Вопросы этнической истории народов Прибалтики: по данным археологии, этнографии и антропологии* (с. 523–543). Москва: Издательство Академии наук СССР].

Halemba, Agnieszka. (1993). Katolicyzm Litwinów w oczach Polaków na Wileńszczyźnie, *Konteksty. Polska Sztuka Ludowa. Antropologia kultury – enografia – sztuka*, 3–4, s. 69–75.

Kalnius, Petras. (1998). *Etniniai procesai Pietryčių Lietuvoje XX a. antrojoje pusėje*. Vilnius: „Žara".

Kozłowska-Doda, Jadwiga. (2021). *Tożsamość, losy i język najstarszych mieszkańców okolic Dociszek na Białorusi (na podstawie badań terenowych z przełomu XX i XXI w.)*. Lublin: Wydawnictwo Werset.

Merkienė, Regina. (1997). Kultūrų sąveikos ir tautinis tapatumas Rytų Lietuvos ir Vakarų Baltarusijos kaime (XIX a. pab. – XX a. pirmoji pusė). *Lituanistika*, 4(32), pp. 66–86.

Pershai, Alexander. (2008). Localness and Mobility in Belarusian Nationalism: The Tactic of Tuteishaść. *Nationalities Papers*, 36(1), pp. 85–103.

Šliavaitė, Kristina. (2015). Kalba, tapatumas ir tarpetniniai santykiai Pietryčių Lietuvoje: daugiakultūriškumo patirtys ir iššūkiai kasdieniuose kontekstuose. *Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos*, 15(24), pp. 27–51.

Turska, Halina. (1939/1982). O powstaniu polskich obszarów językowych na Wileńszczyźnie. W: Janusz Rieger, Wiaczesław Werenicz (red.). *Studia nad polszczyzną kresową*. T. 1 (s. 19–122). Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk–Łódź: Zakład Narodowy im. Ossolińskich.

Vahtin, Nikolaj; Golovko, Evgenij; Švajtcer, Peter. (2004). *Russkie starožily Sibiri: Social'nye i simvoličeskie aspekty samosoznaniâ*. Moskva: Novoe izdatel′stvo. [Вахтин, Николай; Головко, Евгений; Швайтцер, Петер. (2004). *Русские старожилы Сибири: Социальные и символические аспекты самосознания*. Москва: Новое издательство].

Vnukovič, Ûrij. (2012). Litovcy v predstavleniâh žitelej belorussko-litovskogo pograničʹâ. *Živaâ starina: žurnal o russkom fol'klore i tradicionnoj kul'ture*, 3, s. 32–35. [Внукович, Юрий. (2012). Литовцы в представлениях жителей белорусско-литовского пограничья. *Живая старина: журнал о русском фольклоре и традиционной культуре*, 3, с. 32–35].

Vnukovìč, Ûryj. (2014). Narodnaâ kul′tura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 1, s. 387–442. [Внуковіч, Юрый. (2014). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 1, s. 387–442].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



Vnukovìč, Ûryj. (2015). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 2, s. 393–455. [Внуковіч, Юрый. (2015). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 2, s. 393–455].

Vnukovìč, Ûryj. (2016). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 3, s. 421–462. [Внуковіч, Юрый. (2016). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 3, s. 421–462].

Vnukovìč, Ûryj. (2017). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 4, s. 349–375. [Внуковіч, Юрый. (2017). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 4, s. 349–375].

Vnukovìč, Ûryj. (2018). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 5, s. 333–355. [Внуковіч, Юрый. (2018). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 5, s. 333–355].

Vnukovìč, Ûryj. (2019). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 6, s. 326–356. [Внуковіч, Юрый. (2019). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 6, s. 326–356].

Vnukovìč, Ûryj. (2020). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 7, s. 409–431. [Внуковіч, Юрый. (2020). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 7, s. 409–431].

Vnukovìč, Ûryj. (2021). Narodnaâ kulʹtura Vìlenščyny ŭ palâvyh zapìsah pačatku XXI stagoddzâ. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 8, s. 337–361. [Внуковіч, Юрый. (2021). Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 8, s. 337–361].

Vyšniauskas, Vidmantas. (2020). „Čia pas mus“ – kraštietiškumas Pietryčių Lietuvoje: Šalčininkų rajono atvejis. *Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos*, 20(29), pp. 81–104. DOI: https://doi.org/10.33918/25386522-2029004

Unukovičius, Jurijus. (2014). Lietuvių įvaizdis Vilniaus krašto slavakalbių gyventojų akimis. In: Vida Savoniakaitė (ed.). *Savas ir kitas šiuolaikiniais požiūriais*. (pp. 183–208). Vilnius: LII leidykla.

SUBMITTED: 18.09.2023
ACCEPTED: 23.11.2023
PUBLISHED ONLINE: 1.02.2024

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/07/2026 05:03:57



## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Yury Vnukovich / Юрый Внуковіч** – Białoruś; Mińsk; Narodowa Akademia Nauk Białorusi; Centrum Badań nad Białoruską Kulturą, Językiem i Literaturą; Instytut Sztuki, Etnografii i Folkloru; kandydat nauk historycznych; *specjalność*: etnografia, etnologia, antropologia kulturowa; *zainteresowania naukowe*: białorusko-litewskie pogranicze, tożsamość etniczna, kultura ludowa regionu wileńskiego, stosunki białorusko-litewskie.

*Adres*: Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАНБ, вул. Сурганава 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Wybrane publikacje:*

1. Внуковіч, Юрый. (2009). *Літоўцы Беларусі: этналагічнае даследаванне*. Мінск: Беларуская навука.
2. Внукович, Юрий. (2012). Литовцы в представлениях жителей белорусско-литовского пограничья. *Живая старина: журнал о русском фольклоре и традиционной культуре*, 3, с. 32–35.
3. Внуковіч, Юрый. (2020). Этнічная ідэнтыфікацыя і катэгарызацыя беларусаў і літоўцаў у XIX ст. *Białorutenistyka Białostocka*, 12, с. 377–398.
4. Внуковіч, Юрый. (2021). Вынаходніцтва этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі і Літвы: параўнальная характарыстыка. *Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки*, 1, с. 37–49.
5. Внуковіч, Юрый. (2022). Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння этнічнай ідэнтычнасці. *Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук*, 67(1), с. 69–79.